УДК 930(476)«1850/19»-028.79

П. С. Кручак, дацэнт (БДТУ)

# МІНУЛАЕ БЕЛАРУСІ Ў ПРАЦАХ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНІКАЎ

У артыкуле разглядаеццца працэс станаўлення беларускай гістарычнай навукі ў другой палове XIX ст. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. на беларускіх землях узмацнілася палітыка русіфікацыі. У гістарычнай навуцы ў дадзены перыяд панавала тэорыя «заходнерусізму». Яе прыхільнікі не прызнавалі існавання самастойнага беларускага этнасу. У гэтых умовах менавіта беларускія народнікі першымі звярнуліся да вывучэння мінулага Беларусі і абгрунтавалі права беларускага народа на самастойнае існаванне.

The article covers the process of origination of Belarusian historical science in the second half of XIX century. After suppression of 1863–1867 uprising, the policy of Russification was increased in Belarus. The theory of «Western Russism», denying the existence of separate Belarusian nation and considering the history of Belarus as a part of Russian history, dominated in historical science. Under these conditions, the Belarusian Narodniks (Peopleists) were the first who began to study the history of their nation and, on the basis of analysis of historical sources, has asserted its right for independent existence.

**Уводзіны.** Беларускі нацыянальны рух развіваўся ў другой палове XIX ст. у даволі складаных умовах. У гэты перыяд яшчэ не існавала адзінай назвы для беларускага этнасу і тэрыторыі яго пражывання. Назва «Беларусь» замацавалася толькі за ўсходнімі губернямі – Магілёўскай, Віцебскай і часткай Смаленскай, сярод насельніцтва якіх была шырока распаўсюджана саманазва «беларусы». Заходнія рэгіёны – Мінская, Гродзенская і Віленская губерні (разам з Ковенскай) называліся «Літвой», а іх насельніцтва – «ліцвінамі».

У грамадска-культурным жыцці панавала польская мова. На развіццё этнічнай самасвядомасці беларусаў пасля ліквідацыі ўніяцкай царквы ў 1839 г. адмоўна ўплываў раскол па веравызнанні на праваслаўных і каталікоў. Прычым праваслаўе ўспрымалася як «руская вера», а каталіцызм – як «польская». Расійская афіцыйная навука разглядала Беларуска-літоўскі край як «ісконна рускія землі», а беларусаў як сапсаваную палякамі частку рускага народа. З іншага боку, шэраг польскіх навукоўцаў імкнуліся давесці, што беларуска-літоўскія землі з'яўляюцца часткай Польшчы, а іх славянскія жыхары – этнаграфічнай групай польскага этнасу. У такіх складаных умовах у другой палове XIX ст. і адбываўся працэс станаўлення беларускай гістарычнай навукі.

У беларускай гістарыяграфіі дадзенага перыяду можна вызначыць тры асноўныя накірункі – афіцыйна-клерыкальны, ліберальны і нацыянальна-дэмакратычны. Прадстаўнікі першага з іх наогул не прызнавалі існавання самастойнага беларускага этнасу. Усю гісторыю Беларусі да канца XVIII ст. яны разглядалі як перыяд цемры і масавай паланізацыі. І цяпер, пасля ўз'яднання з Расіяй, беларусы, на іх думку, павінны як мага хутчэй зліцца з брацкім рускім народам. Прадстаўнікі нацыянальна-дэмакратычнага накірунку, наадварот, адстойвалі самабытнасць беларускага народа і яго права на нацыянальнае самавызначэнне. Прадстаўнікі ліберальнага накірунку займалі ў гэтых пытаннях больш памяркоўныя пазіцыі.

Першыя буйныя публікацыі, прысвечаныя Беларусі, з'явіліся ў расійскім друку ў 50-я гг. XIX ст. Іх аўтарам быў Павел Шпілеўскі. У большасці артыкулаў ён паўтараў тэзісы расійскай афіцыйнай прапаганды (у т. л. тэзіс пра «ісконна рускія землі»), але ўсё ж такі лічыў Беларусь асобным этнаграфічным рэгіёнам.

Сітуацыя змянілася пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Царскі ўрад перайшоў да актыўнага вынішчэння ўсяго польскага ў краі. Пад удар трапілі і любыя праяўленні беларускасці.

У 60–70-я гг. XIX ст. пры актыўным удзеле афіцыйных колаў была распрацавана т. зв. «тэорыя заходнерусізму». Паводле яе, Беларусь з'яўлялася культурнай і дзяржаўнай часткай Расіі, а беларусы – адгалінаваннем рускага этнасу. Гісторык Міхаіл Каяловіч у сваіх працах даказваў, што Украіна, Беларусь і Літва гістарычна ўяўляюць сабой адно цэлае і з'яўляюцца неад'емнай часткай Расіі як тэрытарыяльна, так і этнічна. Этнаграфічныя асаблівасці Беларусі тлумачыліся польскімі ўплывамі і падлягалі ліквідацыі. Умацаванню заходнерусізму павінны былі спрыяць шматлікія навуковыя даследаванні народнай культуры беларусаў, якія пры падтрымцы ўрада шырока разгарнуліся ў 60–70-я гг. XIX ст. Навукоўцы (Іван Насовіч, Міхал Дзмітрыеў, Юльян Крачкоўскі, Аляксандр Семянтоўскі і інш.) і сапраўды імкнуліся гэта зрабіць. Аднак фактычна іх даследаванні толькі пацвярджалі існаванне самастойнага беларускага этнасу.

**Асноўная частка.** У гэтых умовах, у пачатку 80-х гг. XIX ст., сярод часткі беларускай інтэлігенцыі, якая прытрымлівалася народніцкіх поглядаў, узнік інтарэс да нацыянальнай праблематыкі. Гэты інтарэс праявіўся ў выпуску ў 1882 г. брашуры пад назвай «Пісьмы аб Беларусі» за подпі-

сам Данілы Баравіка. Галоўнай мэтай выдання абвяшчалася прыцягненне ўвагі грамадскасці да вывучэння беларускага народа і самабытнасці беларускай вобласці. У прадмове да выдання яго аўтары заяўлялі аб намеры выдаць цэлы цыкл лістоў, прысвечаных вывучэнню мінулага Беларусі. Але выканаць свой намер яны так і не здолелі. Першы ліст так і застаўся адзіным.

У пачатку свайго ліста аўтар крытыкуе беларускую інтэлігенцыю за слабае веданне мінулага свайго краю і заклікае яе браць прыклад з інтэлігенцыі Расіі, Украіны і Польшчы, якая дасягнула вялікіх поспехаў па вывучэнні сваіх народаў, павышэнні іх нацыянальнай самасвядомасці [1, с. 24]. Праводзячы агляд літаратуры пра мінулае Беларусі, Д. Баравік дае цікавую ацэнку яе гісторыі з народніцкіх пазіцый. Галоўныя цяжкасці ў развіцці беларускай культуры і беларускай самасвядомасці бачыць у гістарычным мінулым беларускага народа. Пачатак ім быў пакладзены ў XV ст., калі Беларусь трапіла пад моцны палітычна-рэлігійны ўплыў Польшчы. У выніку вышэйшы клас беларускага грамадства хутка пераняў польскую культуру як больш моцную і больш гістарычна развітую. Аднак гэта тычылася толькі вышэйшага класа. Просты народ з дапамогай праваслаўных брацтваў здолеў захаваць сваю самабытнасць, свае звычаі, песні і казкі. І, нягледзячы на пэўныя змены ў рэлігійным жыцці, якія адбыліся ў выніку распаўсюджання ўніяцтва, беларускі народ застаўся такім жа, як і ў пачатку свайго гістарычнага жыцця. У такім выглядзе ён і перайшоў у канцы XVI ст. пад уладу Расіі [1, с. 26].

Уключэнне Беларусі ў склад Расіі не прынесла беларускаму народу лепшай долі. Аўтар адзначае, што наўрад можна знайсці ў Расіі больш бедны, прыніжаны і забіты народ, чым беларусы. Адмоўную характарыстыку ён дае і адмене царкоўнай уніі, бо за два стагоддзі частка народа паспела зжыцца з уніяй і прымусовае вяртанне ў праваслаўе з'явілася новым здзекам над народнай душой.

Пасля падзей 1863 г. сітуацыя ў Беларусі толькі пагоршылася. Дваццацігадовае ваеннае становішча спыніла любую асветніцкую працу ў краі. Пачалася сістэматычная русіфікацыя з дапамогай школы і шматлікіх чыноўнікаў, якія запрашаліся з цэнтральных раёнаў Расіі. Усё гэта робіць любыя, нават самыя нязначныя, рэформы немагчымымі.

Разгледзеўшы ў агульных рысах мінулае і сучасны стан Беларусі, аўтар прыходзіць да высновы, што пазбаўлены самастойнасці і перажыўшы моцную эксплуатацыю, беларускі народ у значнай ступені страціў сваю духоўную энергію. У гэтых умовах аўтар ліста бачыць выхад у разгортванні арганічнай працы на карысць Радзімы, у тым ліку і ў вывучэнні яе мінулага. Пры гэтым, перш за ўсё, неабходна вывучаць жыццё і быт простага народа, які, нягледзячы на ўсе цяжкасці, здолеў захаваць самабытныя рысы беларускай культуры. Вырашэнне гэтай задачы і павінна ўзяць на сябе мясцовая інтэлігенцыя і тым самым разбудзіць народ ад сну. Гэта была тыповая праграма ліберальнага народніцтва.

Зусім з іншых пазіцый падыходзілі да вырашэння нацыянальнага пытання прадстаўнікі рэвалюцыйнага народніцтва Беларусі. Сярод іх на гэты конт існавалі два пункты гледжання. Адна частка народнікаў прытрымлівалася традыцыйных народніцкіх поглядаў і лічыла нацыянальнае пытанне другасным. Галоўнай сваёй задачай яны бачылі рэвалюцыйную барацьбу з мэтай звяржэння самаўладдзя, а гэта, ў сваю чаргу, дасць магчымасць справядліва вырашыць нацыянальнае пытанне і забяспечыць свабоднае развіццё беларускага народа [2, с. 158]. З гэтага асяродка выйшла «Пасланне да землякоў-беларусаў» у пачатку 1884 г. за подпісам Шчыры беларус. Яно стала своеасаблівым водгукам на ліст Данілы Баравіка. Шчыры беларус не адмаўляў, а нават адобраваў імкненне вывучаць мінулае роднага краю і тым самым садзейнічаць ажыўленню грамадскага жыцця ў Беларусі. Аднак, на яго думку, у першую чаргу неабходна вывучаць народныя хваляванні і бунты, сацыяльную структуру грамадства і сацыяльныя адносіны ў ім. Пры гэтым аўтары зусім па-рознаму ўяўлялі сабе беларускі народ. Калі Даніла Баравік бачыў яго як народ, які спіць і ў значнай ступені страціў сваю духоўную энергію, то Шчыры беларус знаходзіў у мінулым Беларусі шмат фактаў, якія сведчаць пра наяўнасць у беларусаў моцнай рэвалюцыйнай сілы, паказваюць на іх імкненне скінуць з сябе цяжкія ланцугі сучаснага грамадства і запрыгоньвання [1, с. 112].

Па-рознаму бачылі аўтары і задачы інтэлігенцыі. Калі Даніла Баравік лічыў магчымым асветніцкую працу на карысць народа пры тым рэжыме, які існаваў, то Шчыры беларус цалкам адвяргаў гэтую магчымасць. Да той пары, пакуль не будзе знішчаны дэспатызм, немагчыма ніякая мірная праца на карысць народа.

Другая група беларускіх народнікаў, наадварот, прапаноўвала падняць нацыянальнае пытанне як сцяг рэвалюцыйнай барацьбы. Іх погляды былі выкладзены ў часопісе беларускіх студэнтаў-нарадавольцаў «Гоман». Звярнуўшыся да нацыянальнай праблематыкі, гоманаўцы ў значнай ступені садзейнічалі абудджэнню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Ужо ў першым нумары часопіса аўтары заявілі, што бачаць сваю галоўную задачу ў абаро-

не інтарэсаў Беларусі як ад польскага, так і ад вялікарускага ўціску, які часта падаецца пад шыльдай культурнай дапамогі з боку больш высакаразвітых роднасных культур.

Аўтары падкрэслівалі, што Беларусь мае свае арыгінальныя асаблівасці, якія дазваляюць лічыць яе самастойным славянскім племенем са сваёй самастойнай гісторыяй, этнаграфічнымі і кліматычнымі асблівасцямі, якія рэзка адрозніваюць яе ад суседзяў – Польшчы, Украіны і Расіі. Пры гэтым, па іх меркаванні, дзякуючы непрахадзімасці балот і лясоў беларускі народ захаваў самыя чыстыя асаблівасці славянскага племені, а беларуская мова большую частку асаблівасцей старажытнай славянскай гаворкі. Такі пункт погляду з цягам часу знайшоў сваё развіццё ў працах пачынальнікаў беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі М. Доўнар-Запольскага і В. Ластоўскага.

Усе гэтыя асаблівасці Беларусі даюць ёй права на аўтаномную федэратыўную самастойнасць сярод іншых народнасцей Расіі. Пры гэтым гоманаўцы выступілі з рэзкай крытыкай асобных прадстаўнікоў украінскай і рускай інтэлігенцыі, якія лічылі, што беларускі народ не мае свайго гістарычнага мінулага і яму лепш застацца пад апекай якой-небудзь больш культурнай народнасці. Такія ідэі з’яўляюцца па прычыне няведання Беларусі і яе гісторыі. Самастойнае жыццё Беларусі групавалася спачатку вакол Полацка, Мінска, Слуцка і іншых гарадоў, дзе былі свае князі і сваё веча, якое было своеасаблівай формай народаўладдзя. У далейшым Беларусь аб’ядналася на федэратыўных умовах з Польшчай і доўгі час яшчэ захоўвала сваю самастойнасць. І толькі пазней, калі Польшча сваім шляхецтвам «разбэсціла» беларускую інтэлігенцыю і падавіла беларускі народ, Беларусь страціла сваю гістарычную самастойнасць. Аднак усе размовы аб забітасці беларусаў моцна перабольшаны і не адпавядаюць фактам мінулага і сучаснага жыцця народа. Беларусы неаднойчы ўздымаліся на барацьбу ў абарону сваёй рэлігіі і супраць прыгнёту. Пры гэтым яны ніколі не з’яўляліся сепаратыстамі. Усе ўмовы іх жыцця робяць любыя сепаратысцкія імкненні немагчымымі. Таму пры іншым стане Беларусь абавязкова адрадзіцца да самастойнага жыцця сярод іншых народаў Расіі на ўмовах свабоднай дамовы з імі.

Ідэя культурнай нацыянальнай аўтаноміі Беларусі ў межах дэмакратычнай Расійскай федэрацыі ў вельмі памяркоўнай форме праводзілася і прадстаўнікамі беларускага ліберальнага народніцтва на старонках легальнага перыядычнага друку імперыі. Для прапаганды гэтай ідэі ўмовы былі вельмі неспрыяльнымі. Таму прадстаўнікі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі 80–90-х гг. XIX ст. маглі праводзіць яе ў жыццё толькі ў форме вывучэння гісторыі і этнаграфіі Беларусі. Асабліва важнае значэнне ў гэтым плане мелі публікацыі ў газеце «Мінскі лісток» цэлага шэрага артыкулаў М. Доўнар-Запольскага, Я. Ляцкага, У. Завітневіча, А. Слупскага. Дадзеныя публікацыі, у якіх праўдзіва апісваліся быт, погляды і гісторыя беларускага народа, абуджалі ў жыхароў Беларусі цікавасць да гісторыі і культуры свёй Айчыны.

У 1889–1990 гг. пад рэдакцыяй М. Доўнар-Запольскага і пры актыўным удзеле У. Завітневіча і М. Шахава былі выдадзены два нумары «Календара Паўночна-Заходняга краю». У выданні змяшчаўся цэлы шэраг артыкулаў па гісторыі і этнаграфіі Беларусі, друкаваліся беларускія песні і вершы. Беларусь паўставала ў іх як цікавы самабытны край са сваёй шматвекавой гісторыяй, культурай і моцным духоўным патэнцыялам. Дзякуючы кемлівасці і таленту яго выдаўцоў, «Каляндар Паўночна-Заходняга краю» дайшоў да шырокай грамадскасці і карыстаўся сярод яе вялікай папулярнасцю [3, с. 8].

Значны ўплыў на фармаванне беларускай нацыянальнай ідэі аказала і этнаграфічнае вывучэнне беларускіх зямель, якое актывізавалася ў 70–80-я гг. XIX ст. Публікацыі М. Нікіфароўскага, І. Сербава, М. Янчука Я. Раманава і іншых даследчыкаў сталі падмуркам для стварэння менавіта нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

**Заключэнне.** Такім чынам, нелегальныя публікацыі беларускіх рэвалюцыйных народнікаў, а таксама публікацыі ў легальным друку прадстаўнікоў беларускай ліберальнай інтэлігенцыі, погляды якой былі блізкімі да народніцкіх, зрабілі велізарны ўплыў на абуджэнне ў беларускім грамадстве цікавасці да мінулага роднага краю і залажылі падмурак для фармавання гістарычнага і палітычнага менталітэту наступнага пакалення беларускай інтэлігенцыі, якая ўзняла сцяг беларускага адраджэння ў пачатку XX ст. Іх погляды на мінулае Беларусі сталі асновай для беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі, якая фармавалася ў гэты перыяд.

## Літаратура

1. Публицистика белорусских народников: нелегальные издания белорусских народников (1881–1884) / сост. С. Х. Александрович, И. С. Александрович. – Минск: БГУ, 1983. – 133 с.

2. Лосинский, Н. Революционно-народническое движение в Белоруссии, 1870–1884 гг. / Н. Лосинский. – Минск: Наука и техника, 1983. – 223 с.

3. Гануш, А. Мітрафан Доўнар-Запольскі / А. Гануш, П. Кручак. – Мінск: Выд-ва «Геронт А», 1995. – 31 с.

*Паступіў 02.04.2010*